Przesyłka opłacona ryczałtem

№ 21 Нядзеля, 1-га Жніўня 1926 г. м. Вільня Год I

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Наш... раджэньне.—Тэрыто... чая і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на ... Шырокі дэм... .—Барацьба з комунізмам.—Нацыянальная царква.—Краевая ... года.— ... не Усходняй Беларусі да Заходняй.

Wilno
Uniwersytecka 9
„Przegląd Wileński"

. . . 3 . 2 зл. 50 гр.
Заграніцу ўдвая даражэй.

А... ...кцыі і Адміністрацыі: Wilno, ul. Niemiecka 1 Hotel ...wski" pokój Nr 23. Рэдакцыя адчынена ад 12 — 2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам — 20 гр.
" сярод тэксту — 25 гр.
" на апош. стар. — 10 гр.
За радок нонпарэля.

Беларуская керэншчына.

На нашых вачах рабілася у 1917 годзе „вялікая“ бязкроўная рэвалюцыя... Гэтая „вялікая“ рэвалюцыя давяла праўдзіва вялікую і магутную калісь дзяржаву да таго жалюгоднага стану, у якім яна знаходзіцца сёньня, з галодным абазьлённым насяленьнем, з затухшай прамысловасьцю, з падваламі і турмамі, поўнымі нешчасьлівых вязьняў і з вялікімі гарамі нязьлічаных народных ахвяраў, замучаных і расстраляных усіх тых, хто ня мог пагадзіцца з агіднай уладай III-га Інтэрнацыяналу.

Мы ведаем цяпер добра, што прычынай лёгкай перавагі комуністаў была мягкацеласьць і сьлімачаства расейскай інтэлігэнцыі. Часта чутно як вінавацяць у гэтым клікушу Керэнскага. А фактычна вінават быў зусім ня Керэнскі, а расейская інтэлігэнцыя, хворая на гэтую клікушацкую керэншчыну, якой сам Керэнскі быў толькі яскравым прадстаўніком. Ад рэвалюцыі расейскай прайшло 8 гадоў. І мы бачым, што на нашым беларускім палітычным небасхіле, пры спробах тварэньня новага палітычнага і соцыяльнага жыцьця, гэтаксама робіцца спроба керэншчыны.

У сучасны мамэнт ня толькі у нас—беларусаў, ня толькі у цэлай Польшчы, але ўва ўсіх народаў і дзяржавах Старага і Новага сьвету ідзе страшэнная барацьба, маючая перадусім падставы эканамічнага змаганьня. Сьвет культуры, навукі, дэмакратыі і парадку змагаецца са сьветам комуністычнага хаосу, ненавісьці і анархіі. Барацьба аснавана на адсутнасьці клясавай раўнавагі, што выкарыстоўваецца 3 інтэрнацыяналам для мэтаў палітычных, пасьля чаго, як мы гэта бачым у Саветах, гэтая адсутнасьць нацыянальнай раўнавагі ня толькі не паменшаецца а паглыбляецца яшчэ больш. Аднак ужо на усім сьвеце комуністы зрабілі вялікі пасьпех і гэта дзякуючы выключна таму, што у большасьці выпадкаў яны мелі за сваіх супрацоўнікаў—мягкацелую керэншчыну. Тое самае робіцца сёньня і у нас тутака ў Заходняй Беларусі. І вось у працэсе барацьбы двух варожых беларускіх сілаў—комуністычнай і антыкомуністычнай, пры спробах разьбіць комуністаў знутры шляхам асьведамленьне народных масаў і рашучай барацьбы усіх дэмакратычных элемэнтаў белар. народу з пралетарска-чужацкай комунай,—раптам зьяўляецца новы чыньнік, нешта сярэдняе прапарцыянальнае паміж дзьвёх якіх ня можна аб'яднаць стыхіяў: комуністычнай і нацыянальна - дэмакратычнай. Іншым чынам, робяцца спробы уваскрасіць расейскую керэншчыну а беларускай глебе. Бо тую працу, якую вядуць п. п. паслы Ярэміч і Рагуля са сваім „Сялянскім Саюзам“ інакш як беларускай керэншчынай і назваць нельга. Мы не гаворым у даным выпадку аб ідэі саюзу і аб праграме яго. Ідэя безумоўна добрая. Праграма—ўжо горшая, бо не мае патрэбнай выразнасьці і акрэсьлянасьці, мешаючы да справаў клясава-сялянскіх справы работніцкія і г. д. Але не у гэтым справа. Ідэя і праграма Керэнскага гэтак сама былі надта добрыя, уся справа тут у тактыцы і ў тым, як гэта праграма праводзіцца у жыцьцё. І вось, за увесь час істнаваньня „Сялянск. Саюзу“ мы можам сканстатаваць поўную адсутнасьць творчай рэальнай працы з боку гэтага Саюзу. Апрача слаўнага зьезду — канфэрэнцыі саюзу у Вільні, на які зьехалася ажно 9 сялян, ніякай рэальнай працы на мейсцох не робіцца. Бо у Саюзе няма імпульсыўных тварцоў, няма моцных інтэлектаў і ўзята неправідловая тактыка. Праўда, Саюз заняў антыбальшавіцкую пазыцыю. Ен проці жыдоўскай калёнізацыі ў Савецкай Беларусі і (нават!) палемізуе з Белкомом! А ў гэты час пралетарская Грамада б'е усюды, дзе толькі можна Сельсаюз і нават даўнейшыя пляцоўкі Рагулі ператвараюцца ў гурткі „Грамады“. І гэта зусім зразумела. Бо ў той час, як Сельсаюз палемізуе і гэтак кажучы змагаецца з комуністычнай групай малебнамі, малебнамі, „Грамада“ іх лупіць шымозамі, шымсзамі...

Добра разумеючы, што пры агульнай слабасьці беларускай інтэлігэнцыі пажаданым зьяўляецца аб'яднаньне ўсіх дэмакратычных адламаў беларускай думкі, якія ня прызнаюць канцэпцыі комуністычнай, мы сымпатычна адносіліся да арганізацыі Сельсаюза і толькі зварачвалі ўвагу на недастачы ў пэрсанальным складзе, у праграме і тактыцы. Цяпер-жа мы бачым, што Сельсаюз у сваім сёняшнім, складзе ёсьць немач, слабенькая копіяблажэннай памяці расейскай керэншчыны. І мы можам ужо прадбачыць прыкрую будучыну гэтай арганізацыі: яна альбо будзе праглынута комуністычнымі групамі, як „Грамада“, альбо памалу сканае сама па сабе. Дзеля гэтага мы, у праконаньні, што змагацца з комуністамі можна толькі тымі спосабамі і сродкамі, якімі змагаюцца з намі яны, г. зн. на тэрор адказваць тэррорам і г. д., а не займацца сьлімачаскай балтаўнёй, будзем адносіцца нэгатыўна да Сельсаюзу да таго часу, пакуль ён ня выйдзе на просты шлях абароны клясавых сялянскіх інтарэсаў белар. народу, з бязумоўным, рашучым і актыўным змаганьнем з ворагамі сялянства—комуністамі.

ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

Францыя нядаўна перажыла цяжкія дні. Дайшло да таго, што кабінэты пачалі падаць праз два дні пасьля арганізаваньня, г. зн. хутчэй, чымсь патрэба было часу, каб яго ўтварыць. Кабінэт Брыяна — Кайо праістнаваў каля 10 дзён. А чарговы пасьля яго кабінэт Эрыё праістнаваў толькі два дні. На біржы падняўся перапалох. У адзін дзень курс франка ўпаў з 200 на 242 за фунт штэрлінгаў. Масы кінуліся да банкаў і пазычковых касаў, дамагаючыся звароту сваіх ашчаднасьцяў. У некатарых крамах адмаўляліся прыймаць француськія франкі. Цэны пачалі шалёна расьці. У Парыжы на вуліцах пачаліся антыдзяржаўныя дэманстрацыі, напасьці на чужаземцаў, асабліва ангельцаў і амэрыканцаў. І гэта ўсё зрабілася ў адзін—два дні пасьля апошняй спробы ўтварыць кабінэт левага блёка. Найбольш варожа масы былі настроены проці сацыялістаў і комуністаў, а таксама і левых радыкалаў, якія сваей абструкцыйнай тактыкай у парлямэнце не давалі магчымасьці працаваць ніводнаму ўраду. У парлямэнце ў кожны час састаўлялася большасьць, каб паваліць урад, але не было большасьці для правядзеньня ўрадавых праэктаў. У рэзультаце комуніста Кашэна народ пабіў, калі ён выхадзіў з парлямэнту; на лідэра сацыялістаў жыда Блюма таксама напалі і ён выратаваўся толькі дзякуючы паліцыі, а левага радыкала Эрыё вылаялі на вуліцы. І няма ведама чым-бы ўсё гэта скончылася, калі-б не паявіўся на сцэне Пуанкарэ.

Усе ўва Францыі пабачылі, што край хутка ляціць у пропасьць. Можна сабе выабразіць, да чаго магла давесьці гэткая паніка на біржы і гэткі катастрафічны ўпадак француськай валюты, калі ўзяць пад увагу аграмадныя вонкавыя і ўнутраныя даўгі Францыі, якіх ёсьць больш за 500 мільярдаў франкаў. Праз колькі дзён магло прыйсьці поўнае фінансавае банкроцтва дзяржавы і ўсяго народа. Трэба ведаць псыхіку і характар француза, надта ўражлівага і палахлівага. Кожны француз надта эканомны. Кожны з іх трымае свае ашчаднасьці ў якіхсьці прадпрыемствах або акцыях. Колькі мільёнаў французаў ужо пацярпела дзякуючы бальшавікам, страціўшы свае ўклады ў расейскія цэнныя паперы і прадпрыемствы. Цяпер Францыя перажывае цяжкі фінансавы крызіс не дзеля таго, што няма чым плаціць падаткі, а дзеля таго, што ніхто ня хоча падаткаў плаціць, зваліваючы гэта на іншых. І раптам француская валюта і францускія акцыі ў адзін дзень пачалі траціць адну чверць сваей вартасьці. Страх, каб праз колькі дзён не зрабіцца ўсім банкротамі, адразу перацягнуў палітычную вагу на бок Пуанкарэ, як рэальнага палітыка, для якога агульныя дзяржаўныя справы вышэй за ўсялякія партыйныя інтрыгі. Пуанкарэ адразу ўцяміў, што трэба паступіць рашуча. І як толькі яму запрапанавалі саставіць новы кабінэт, ён адразу зьвярнуўся да найбольш выдатных ранейшых дзяржаўных дзеячоў усіх партыяў апрача сацыялістаў, якія адмовіліся ад учасьця ў урадзе, прапануючы утварыць кабінэт „нацыянальнай лучнасьці“, або „нацыянальнага ратунку“. І амаль ніхто не адмовіўся працаваць з ім разам. У працягу аднаго дня быў састаўлены кабінэт, у які ўвайшлі гэткія палітычныя дзеячы розных напрамкаў, як Брыян, Эрыё, Пэнлевэ, Тард'е і інш. У кабінэце Пуанкарэ ёсьць шэсьць быўшых прэмьераў, з іх ліку Брыян быў прэмьерам ажно дзесяць разоў.

Перадача ўлады Пуанкарэ адразу супакоіла край і заграніцу. Франк

падняўся з 240 да 200 і вышэй за фунт штэрлінгаў. Цэны пачалі падаць. Паніка спынілася. І пачалося ўва Францыі ізноў супакойнае жыцьцё. Гэтак бязслаўна закончылася двохгадовая дзяржаўная дзеяльнасьць левага блёка ўва Францыі. Хаця кабінэт „нацыянальнай лучнасьці“ Пуанкарэ у цяперашнім складзе рахлічае на большасьць у парлямэнце, але ёсьць магчымасьць далейшай абструкцыі з боку левага блёка, які яшчэ не разбіты ў парлямэнце. Сацыялісты і комуністы ня годзяцца з тым фактам, што страцілі магчымасьць мець уплыў на ўрад і падгатаўляюцца да рашучага змаганьня. Дзеля гэтага зусім магчыма, што будзе распушчаны цяперашні парлямэнт і будуць назначаны новыя выбары, якія могуць даць зусім новыя адносіны палітычных сіл, на новых выбарах нацыянальнаму блёку ўдасца вярнуць сваю пазыцыю, страчаную 11 траўня 1924 г.

Ня менш крытычны мамэнт перажывае ў апошні мамэнт і Польшча. У Сойме разглядаўся ўрадовы праэкт аб зьмене констытуцыі і надзвычайных паўнамоцтвах ўраду. Труднасьці былі ў тым, што для зьмены констытуцыі патрэбны дзьве трэціны галасоў Сойма, у той час, як у Сойме ёсьць выразная большасьць проці ўраду. Але за апошні час сытуацыя у парлямэнце значна зьмянілася. Правыя партыі і цэнтр, проці якіх выступіў са збройным пратэстам маршалак Пілсудскі і якія зьяўляюцца большасьцю ў Сойме, не толькі не былі проці зьмены констытуцыі, але нават выступілі са шмат большымі зьменамі, чымсь дамагаўся ўрад. Правая рэакцыя чамусьці пераконана, што ўсё вернецца да ранейшага палажэньня і што рэзультатам зьмены констытуцыі з часам будуць карыстацца рэакцыйныя ўрады. Дзеля гэтага яны і пастанавілі зьмяніць констытуцыю ў напрамку пашырэньня ўлады прэзыдэнта Рэспублікі і ўрада. І калі ўсё-ткі не прайшлі ўсе тыя праэкты зьменаў констытуцыі, якія прапанавалі эндэкі, дык толькі дзеля таго, што проці гэтага выступілі адзіным фронтам левыя партыі з нацыянальнымі меншасьцямі. У рэзультаце гарачых спрэчак былі прыняты ў 3 чытаньнях гэткія важнейшыя зьмены, якія даюць зусім іншы дух констытуцыі. Перш-на-перш прэзыдэнт Рэспублікі атрымаў права распускаць Сойм і Сэнат і назначаць новыя выбары. Гэтым правам як ведама карыстаюцца прэзыдэнты дзяржаваў амаль што ня ўсюды. Нестача гэтага права ў нас была найбольшай слабасьцю нашай констытуцыі. Дзеля гэтага галоўным чынам і распачалася рэвалюцыя ў траўні. Цяпер згодна з прапазыцыяй Урада прэзыдэнт Рэспублікі можа ў кожны час распусьціць Сойм і Сэнат, назначаючы новыя выбары праз 90 дзён.

Далей прэзыдэнту Рэспублікі даецца права ў часе роспуска Сойма выдаваць урадовыя распараджэньні, якія маюць сілу закона. Аднак гэтыя распараджэньні ня могуць датычыцца зьмены констытуцыі і пытаньняў, прадбачаных у 4, 5, 6, 8, 49, 50 і 51 параграфе. У гэтых параграфах гаворыцца аб ліку новабранцаў, аб праве аб'яўленьня вайны, дзяржаўным бюджэце, назначэньні новых падаткаў, тарыфаў і заграпічных аплат, зьмены выбарнага права ў Сойм і Сэнат. Як-ні-як гэта значна пашырае дзеяльнасьці выканаўчай улады ў галінах адміністрацыі. Проці гэтага права ўрада з найсільнейшым пратэстам выступілі левыя партыі, але яно ўсё-ткі прайшло.

Далей ужо звычайнай большасьцю галасоў былі прыняты надзвычайныя паўнамоцтвы для цяперашняга кабінэта да мамэнта склíканьня новага Сойма. Гэтыя паўнамочча прайшлі дзякуючы галасам крайніх правых і і. дэмакратычных партыяў, а таксама некатарых нацыянальных меншасьцяў, якія давераюць цяперашняму ўраду. Гэтыя паўнамоцтвы ня могуць пярэчыць констытуцыі і ня могуць датычыцца назначэньня новых падаткаў або павялічэньня старых, увядзеньня новых манаполіяў, ходу мэталёвай і дробнай манэты вышэй устаноўленай нормы, прадажы, замены і аблажэньня падаткамі дзяржаўных маемасьцяў, зьмены выбарнага закона ў Сойм, Сэнат і самаўрады, зьмены граніцаў ваяводзтваў, закона аб мовах і школах і закона аб шлюбах. У галіне-ж рэарганізацыі адміністрацыі, шуканьня способу для падтрыманьне роўнавагі бюджэта, эканамічных пытаньняў і асабліва сельскай і лясной гаспадаркі даецца прэзыдэнту Рэспублікі права выдаваць распараджэньні, якія маюць сілу закона.

Гэткім чынам цяперашні ўрад мае шмат больш правоў, чым кожны з папярэдніх. Але дзеля таго, што гэтыя надзвычайныя правы даюцца толькі на час да склíканьня новага Сойма, дык урад зацікаўлены ў тым, каб ня быць зьвязаным цяперашнім Соймам, але разам з гэтым, каб і не распускаць яго, дзеля таго што трэба было-б вызначыць новыя выбары. І ўрад, як відаць, думае цярпець далей гэты нязвольны да жыцьця Сойм. Дзякуючы гэтаму левыя партыі і нацыянальныя меншасьці, якія дамагаюцца роспуска Сойма, перайшлі ў опозыцыю.

Але гэтым яшчэ ня кончыўся крытычны мамэнт. Эндэцыя і Пяст унесьлі ў Сойм праэкты зьмены выбарнага закона, якія будуць разглядацца ў бліжэйшыя дні. Гэтыя рэакцыйныя праэкты кіруюцца да таго, каб значна ўрэзаць правы нацыянальных меншасьцяў і дэмакратычнага элемэнта. З гэтай прычыны паднёў гвалт нават „Kurjer Poranny“, раючы ўтварыць агульны дэмакратычны фронт проці супольнай небясьпекі, якая пагражае з боку рэакцыі.

N.

Канец чырвонага ката.

20 ліпня з Расеі была атрымана радасная вестка аб тым, што ў Маскве здох вядомы расейскі кат Фэлікс Дзержынскі.

Як паведамляюць савецкія газэты, яшчэ за тры гадзіны да гэтага Дзержынскі выступаў з прамовай на паседжаньні цэнтральнага камітэту комуністычнай партыі. Пасьля паседжаньня ён паехаў дамоў, дзе раптоўна і здох.

Канец ката выклікаў вялікую паніку сярод комуністычных правадыроў. Да вечару аб сьмерці Дзержынскага ведалі толькі галоўныя комуністычныя дзеячы і толькі каля поўначы аб гэтым было выдана афіцыяльнае паведамленьне, у якім гаворыцца, што Дзержынскі памёр нібы ад паралiча сэрца. Аднак у Маскве насяленьне ня верыць гэтай вэрсіі. Ходзяць упартыя чуткі аб тым, што яго забілі ці атруцілі ягоныя супрацоўнікі з апазыцыі, іншыя кажуць аб самагубстве. Каб спыніць гэтыя чуткі, па загаду савецкай улады была зроблена сэкцыя трупа і пратакол сэкцыі, падпісаны некалькімі прафэсарамі, быў шырока апавешчаны. Аднак насяленьне не паверыла і гэтаму пратаколу.

Чырвоны кат Фэлікс Дзержынскі — гэты вырадак польскага народу — радзіўся ў Вільні ў 1877 г. Доўгі час ён працаваў у літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі, за што царскі ўрад некалькі разаў яго арыштовываў і высылаў у Сыбір. Пасьля бальшавіцкага перавароту Дзержынскі, які быў у блізкіх прыяцельскіх адносінах з падохлым Ленінам, адразу высоўваецца і займае становішча камэнданта бальшавіцкага засьценка ў Смольным. Калі была створана „чрэзвычайная“ камісія (чэка), Дзержынскі становіцца на яе чале і ад гэтага часу пачынаецца яго крывавая кар'ера ката. Па яго загаду і пад яго безпасрэдным кіраўніцтвам „чэка“ залівае Расею крывёю мільёнаў непавінных ахвяраў. Пад шум аўтамабільных матораў па ўсіх кутках Расеі расстрэліваюцца штодня тысячы людзей. Нельга дакладна акрэсьліць колькасьць яго ахвяраў. Спробы падлічыць іх праўда рабіліся. Гэтак ангельскі прафэсар Саралея падае гэткую лічбу крывавых ахвяраў Дзержынскага на лістапад 1923 года: 28 епіскапаў, 1.219 сьвяшчэньнікаў, 6.000 прафэсараў і вучыцялёў, 9.000 дактароў, 64.000 афіцэраў, 260.000 жаўнераў, 70.000 паліцэйскіх, 12.950 земляўласьнікаў, 355.250 інтэлігэнцыі, 193.290 работнікаў і *815.000 сялян.* А другі расейскі статыстык даводзіць, што колькасьць гэтых ахвяраў у сярэднім можа быць выражана цыфрай у 5.000 чалавек у дзень, ці каля 1.800.000 у год. Здаецца, што гэтая апошняя цыфра — бліжэй да праўды.

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

У Польшчы.

— Прынятыя Соймам урадовыя праэкты аб зьмене констытуцыі і і паўнамоцтвах ураду перайшлі на разгляд Сэнату. На наступным паседжаньні Сойму, якое адбудзецца 30 ліпня, будзе разглядацца пытаньне аб роспуску Сойма.

— Выкрыта вялікая шпіёнская арганізацыя, якая працавала на карысьць Нямеччыны і Саветаў. У Львове, Перамышлі, Станіславове і Кракаве арыштавана каля 100 чалавек цывільных і вайсковых. Арыштавана шмат вайсковых украінцаў. Пры вобысках знойдзены сэкрэтныя вайсковыя распараджэньні, шмат аружжа. Сьледства яшчэ не закончана.

— Лічба безработных у Польшчы зьменшылася на 5.933 чалавека. Усяго засталося яшчэ 283.263 безработных.

Вяч. Шышкоў.

Парада.

(Апаведаньне са зборніку выданага ў Маскве).

(Глядзі № 18.)

— Прашу запратаколіць! ўскачыў вусач і задрыгаў на месцы. У пратакол! Я яго, падляца белагвардзейца шчэ ня так аблаю.

— Галіў твой дзед ды і той з кілой быў! крыкнуў Сілант. Як ты, сьцерва, можаш заводзіць скандалы, калі тутка начальства? Хто цябе запрасіў на параду, ўсхваляць мяне? Га? браты! гані яго вон па шыі!

Узьняўся рогат, сьвіст; вусач і Сілант ськіраваліся ўжо адзін на аднаго, ды паміж імі стаў народ; пачалі ўгаварываць, лаяліся, пагражалі. Гараська плакаў: „татка! татка!“ Нарабраз схапіў партфэль і тросся так, што з носу зьляцелі акуляры. Бог ведае чым-бы ўсё гэта скончылася, каб не дасьціп сьвяшчэньніка:

— Грамадзянін — начальнік і праваслаўныя хрысьціяне! гулкім басам гукнуў ён, ускочыўшы на стол: Ня будзем псаваць гэткай парады! Возьмемся ў згодзе ды любві за угашчэньне...

Угашчалася чалавек пятнаццаць. Рэшту Сілант выпхнуў з хаты і замкнуў на гак дзьверы. На стале піва, бутэлькі з самагонкай, вінігрэт, селядцы і два пірагі з брагу вялічынёй. Самавар ў два вядры стаяў сярод бутэляк і фыркаў парам, быццам казаў: фу — ты, чорт, вось дык парада!

Нарабраз сеў, а ўсе стаялі. З абразоў скінулі заслоны.

— Бацюшка, айцец Сяргей, памаліцца трэба, нясьмела запрапанаваў белы старык і галава яго затраслася.

— Я, айцы — не магу, калі адзін толькі голас, — адказаў той і мігнуў на чырвоны загрывак нарабраза. Цяперака трэ' большасьцю галасоў.

— Аксён — хутчэй стаў на балаціроўку, сказаў Янка-салдат.

— Хто проці? крыкнуў Аксён. — Прынята!

— Баця, валі! скамандаваў Сілант.

Усё гэта прайшло нязвычайна хутка: нарабраз не пасьпеў і акуляраў выцярці хусткай. „Отчэ наш“, прапелі згодна, жагналіся шчыра.

— Сярод нас ідэйны павадыр. Выпьем за яго здароўе!

— Самагонка забараняецца законам, — сказаў нарабраз — і выпіў.

— Абавязкава забараняецца, сказаў Сілант і наліў.

Зрабіце ласку...

— Ці не загуста будзе? спытаўся нарабраз, — выпіў і закусіў грыбком.

— Зусім на'т ня густа, сказаў Сілант ізноў напаўняючы шкляначкі, — калі густа, дык густа і ёсьць... Прызваіта... Будзьце ласкавы!

— За росквіт адзінай трудавой школы, гура! крыкнуў нарабраз, выпіў і задрыгаўся: брррр!

Усе крычалі гура! Сілант крыкнуў: „Сяуха-а-ай“! і скрывіўшы вусны дзіка зацягнуў:

— Мы сво-о-ой... ммы новы сьвет... сьвет-т!...

Пілі, моцна цямкалі, сапалі. Сяляне падшумок заліхівалі па кішэням кавалкі пірага. Ураз усе пьянелі.

Чырвонагаловы, ўвесь рабы ад воспы дзядзька горка галасіў і сморкаўся ў шапку суседа:

— Аксён... Аксён... Ах, да чаго-ж гэта дзіўна... стагнаў ён, пырхаючы і з піскам... тут табе начальства сядзіць, а тут, знацца я са сваёй мордай на месцы свайго сяданьня... Аксён, тав-таварышш...

Сілант усё пробаваў пагладзіць бараду ды адкінуць кудлы і ўсякі раз пагражаў Янку-салдату сваім каравым пальцам.

Гамані ўсі разам, бяз толку і гулка.

— Таварыш нарабраз! таварыш! дарэмна завываў Сілант. Гэй, бабы! кратайся там з півам!

— Пій, не шкадуй!... Свае-ж...

— Браты! з начальствам гуляем... Вось як ражым...

— Таварыш шарабраз! Давай нам добрых вучыцялёў, падняўся і ізноў хлюпнуўся Сілант.

— Энергічных — падхапіў Аксён.

— Маўчы, дурань! Сілант нахіліўся праз стол, вывярнуў кварту з півам і пачаў — смачна, з цямканьнем цалаваць гасьця. Міла-ай... Таварыш шарабраз... Абгаліўся я значыцца ў чэсьць улады... Мілай... Сябе не пашкадаваў... Вось як тут — ен замацыста высмаркаўся і захліпаў —

Напярэдадні канца.

З Масквы паведамляюць, што ў апошні час значна завастрылася барацьба паміж Палітбюро і г. зв. „апазыцыяй“. Гэтымі днямі ў Маскве адбыўся сэкрэтны сход прадстаўнікоў „апазыцыі“, на якім былі прысутнымі каля 100 выдатнейшых комуністычных дзеячоў. Калі ўлады даведаліся аб гэтым сходзе і яго складзе—была вынесена пастанова зьліквідаваць гэтую новую „контрэвалюцыю“. У зьвязку з гэтым у Маскве адбыліся арышты выдатных комуністычных дзеячоў. Арыштаваны між іншымі б. камісар Фінансаў Сакольнікаў і вядомы комуніст Лашкевіч, а таксама шмат прадстаўнікоў вышэйшага каманднага састава чырвонай арміі.

У зьвязку з ліквідацыяй апазыцыі, вядомага Грышку Зіноўева на апошнім паседжаньні Ц.К. комуністычнай партыі пастаноўлена выключыць з Палітбюро.

ГПУ атрымала загад рашуча змагацца з апазыцыяй.

Як апазыцыя, так і іх праціўнікі шыкуюцца да аружных выступленьняў. Сьцягваюцца войскі „верныя“ кожнаму лягеру. У Маскоўскім Крэмле, дзе знаходзіцца штаб-кватэра бальшавіцкіх цароў—пануе страшэнная трывога. Многія з главароў лічаць, што падзеі могуць прывясьці да поўнага зьліквідаваньня Савецкае улады...

Відаць надыходзяць апошнія дні савецкай улады і магчыма, што ў бліжэйшай будучыне мы будзем сьведкамі таго, як расейскі народ будзе распраўляцца са сваімі катамі.

Што-ж: памагай Бог і хутчэй!

ЗА ГРАНІЦАЙ.

Англія. Забастоўка вуглякопаў часткова ліквідуецца. У некаторых вокругах работнікі атрымалі дабаўку да заработнай платы і пачалі працаваць. Прадбачыцца хуткі канец забастоўкі.

Францыя. Пасьля правалу кабінэта Брыяна, паўстаў кабінэт Эрыо-Кайо, які праз два дні свайго істнаваньня атрымаў у палаце вотум недаверыя і прымушаны быў падацца ў адстаўку. Пасьля гэтага місія тварэньня новага ўраду была даручана Пуанкарэ, які гэтую місію і выканаў. У склад новага ўраду ўваходзяць тры бышыя прэмьера: Пуанкарэ, Эрыо і Брыян. На паўстаньне ўраду Пуанкарэ біржа зарэагавала значнай падвышкай франка. За фунт штэрлінгаў, які ў часе кабінэту Эрыо дайшоў да—250 франкаў, цяпер даюць толькі 188 франкаў. Парлямэнт 358 галасамі проці 131 прыняў вотум даверыя для ўраду Пуанкарэ.

Літва. Літоўскі Сойм прыняў закон аб скасаваньні на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі кары сьмерці.

Саўдэпія. У прыволжскіх губэрніях зьявілася саранча, якая зьнішчае ўсе пасевы. Пацярпелі ад яе галоўным чынам Саратаўская і Астраханская губэрніі. Агулам тэрыторыя пацярпеўшая ад саранчы дасягае 640 кв. кілёмэтраў. У адной толькі вёсцы сяляне закапалі ў зямлю каля 6.000 пудоў саранчы.

Амэрыка. У апошні час стаіць страшэнная пякота, ад якой памёрла каля 100 чалавек. У Нью-Джарсэй вялікі гураган нарабіў шмат стратаў.

Чэхаславакія. Вялікую сэнсацыю выклікала тут адкрыцьце, што шэф гэнэральнага штабу гэнарал Гайда зьяўляецца бальшавіцкім шпіёнам. Гэн. Гайда звольнены з пасады.

Сірыя. З Бэйрута паведамляюць, што французы мелі вялікую перамогу над Друзамі. Каля 200 паўстанцаў забіта і 300 забрана ў палон. Узноўлена камунікацыя паміж Дамаскам і Багдадам..

Індыя. Рэлігійная вайна паміж магамэтанамі і індыйцамі ўсё больш завастраецца. У Калькуце дайшло да паважных забурэньняў, у часе якіх 7 чалавек забіта і каля 100 ранена. У Бангалоне—4 забіта і 14 ранена.

У С. С. Р. Р.

Дзяржаўныя даўгі.

Цікавыя данныя зьмяшчае „Комсамольская Праўда“ у № 57 аб суме дзяржаўнага даўгу, які прыходзіцца на „душу“ насяленьня савецкай рэспублікі. Аказваецца, што цяпер доўг вялікшы чым у царскія часы. З паданых газэтай цыфраў відаць, што на душу насяленьня Расеі ў 1913 годзе прыходзілася даўгу—73 р. 2 к., а ў 1923 г.—гэтая сума вырасла да 90 руб. 2 к. Няведама чаму не паказана сума гэтага даўгу цяпер, у 1926 г. Мусіць надта вялікая, каб яе можна было паказваць. А што павялічылася дык ясна, бо каб зьменшылася, дык аб гэтым бы пачалі трубіць бальшавікі на ўвесь сьвет, як аб „дасягненьні“, а апрача таго, вядома ўсім, што іменна ў апошнія гады Саветы раскідаюць найбольш народных грашоў на розныя рэвалюцыі ў Кітаі, паўстаньні рыфэнаў, друзаў і інш., дапамогі ангельскім вуглякопам і на комуністычную агітацыю ўва ўсім сьвеці...

Дарага-ж абходзіцца хвалёны сацкі „рай“!..

ве

Як жывецца „спэцам“.

Як ведама, спробы вясьці фабрыкі і заводы без інжынераў і тэхнікаў, а толькі праз Камітэты рабочых паказалі, што нічога нельга зрабіць без кіраўнікоў-спэцыялістаў. І бальшавікам прышлося ткі звярнуцца да гэтак зьненавіджаных інтэлігэнтаў—буржуяў. Але як-жа так: далоў інтэлігэнтаў—буржуяў і раптам давай іх сюды, бо бяз іх ня можа ісьці праца? Гэта-ж было-б адмовай ад ўсіх лёзунгаў комуністычных прарокаў. І вось прыдумалі: інтэлігэнтаў на работы „паставіць як „спэцаў“, а над імі паставіць камісараў. Праца так-сяк наладзілася. Як жылося гэтым „спэцам“ дагэтуль—амаль усім вядома. Гэта былі мучанікі. І апошнія часы ішлі чуткі, што ўсё „там“ зьмянілася, жыцьцё і адносіны наладзіліся; няма чэкі, няма тэрору і г.д. Маскоўская „Праўда“ ў № 130 (3359) дае абразок гэтых „наладжаных адносінаў з жыцьця аднаго, Таганрогскага Госкожзавода.

На гэтым заводзе гаспадарыць прадседацель заводзкага камітэту нехта „тав.“ Ткачэнка. Разумеецца—комуніст самай чыстай вады. Сваё палажэньне ён асабліва замацаваў агітацыяй сярод рабочых проці інтэлігэнтаў наагул, якіх называе „барамі“; асабліва проці інжынераў і тэхнікаў. Сам ня вучоны, сярод гэткіх-жа някультурных рабочых—ён меў вялікі пасьпех. І вось рабочыя ня маючы магчымасьці зусім прагнаць інжынераў, бо бяз іх—стала-б уся фабрыка, пачалі іх „травіць“ уселякімі спосабамі. Так аднаго інжынера Клейна чуць не забіў рабочы, запусьціўшы ў яго камням ф. у 5 вагай, за тое, што той ідучы неяк у машынны аддзел, не даў яму... прыкурыць. І гэты рабочы застаўся на заводзе. Пасьля — пачалася траўля іншых „спэцаў“. „Спэцы“ пачалі ўцякаць. Тады ім прыказалі працаваць, бо інакай—контррэвалюцыя!.. Калі адзін з інжынераў—Дзятлаў, неяк выразіўся пра Ткачэнку „шалапай“, дык той дабіўся звальненьня Дзятлава з „воўчым білетам“. Як жывецца гэтым бедным „спэцам“ відаць з таго, што яны на'т баяцца падаць жалабу на крыўдзіцеляў і тыя пазваляюць сабе, што захочуць...

„Нашага прадзаўкома трэба асадзіць“ канчае карэспандэнт газэты...

Што тутка „асадка“ паможа? Дзікар-партыяц усё роўна ня спыніць сваіх зьдзекаў над тымі, хто разумней і больш культурны чым ён, хоць-бы проста з заздрасьці. І пакуль гэтыя дзікары будуць кіраваць жыцьцём і адносінамі, — паміж тымі хто кіруе працай і яе выконвае ніколі ня будзе ладу. Ня дзіва, што культура Расеі так нізка падае замест ісьці ў гару і толькі ў адным відаць поступ: у агульным зьдзічэньні і варожасьці.

Савецкі „крэдыт“ сялянам.

На паперы тав. комуністы сталі „тварам да вёскі“ і „ідуць на сустрэчу таварышу—селяніну“. А на дзеле, у той час, як рабочы гарадзкі мае ўселякія дапамогі, крэдыты і ўсё іншае, сялянам даюцца толькі нейкія крошкі, ды і то за высокі працэнт, якога не пастыдаўся-б і стары буржуй—лавачнік, ці „крывапійца—купец“. Вось абразок з жыцьця вёскі ў часе павароту комуністычнага твару да вёскі. Ідучы на спатканьне патрэбам вёскі ў крэдыце гаспадарчыя ўстановы пастанавілі выдаваць сялянам у доўг земляробныя машыны і насеньня. І вось пачалася гэтая выдача. Крэдыт устанаўляецца на час ад году да 2. але кожная рэч купленая ў доўг абходзіцца селяніну чуць не ўдвая даражэй. Вось пара цыфраў з газэты „Праўда“ № 132 (3362): пуд вікі за грошы на рынку каштуе 1 р. 30 к. да 1 р. 50 к. а ў „доўг“ прадаецца гаспадарчымі ўстановамі па 2 р. 80 кап.;

Пляуг каштуе 18 р. 50 кап., а у доўг—23—25 р.; за яравое насеньне, якое селянін бярэ вясной на пасеў, ён павінен аддаць за адзін пуд вартасьць 2—3. „Ад гэтага падрываецца аўтарытэт сельска-гаспадарчай каапэрацыі, а кулак падымае галаву, бо ў яго ўсё таней!..“ сумна кажа карэспандэнт.

Але, скажам і мы: за тое комуністычны твар таўсьцее і ад сялянскага поту дабрэюць камісары і маюць магчымасьць езьдзіць па заграні́чным курортам, піць дарагое віно, а іх жонкі і любоўніцы франтаваць у брылянтах... А мужык нічога: заплача, але заплаце. На то „свая“ — работніцка-сялянская ўлада!

ЖЫЦЬЦЁ ПРАВІНЦЫІ.

Далоў з комунай!..

(*в. Міжэвічы, Слонімск пав.*).

У № 20 „Беларускай Справы“ ад 26—6 г.г. была надрукована карэспандэнцыя з Міжэвіцкай гм. „Свой свайго хваліць, а праўду ганіць“, падпісаная псэўдонімам „Мужык з захалусьця“. Фактычным аўтарам яе зьяўляецца жыхар вёскі Селявічы Паўлюк Серкевіч, які яшчэ перад надрукаваньнем гэтай карэспандэнцыі казаў усім, што будзе нешта надрукована ў яго газэце „Беларуская Справа“. Гэты Серкевіч—афіцыяльны „муж даверыя“ Сялянска-Работніцкай Грамады і комунізуючая „пэрсона“ ў нашай гміне — піша ў сваей карэспандэнцыі: „Ведамы ўсім Паўлюкевіч“...—Гэта—праўда, бо ўсё чэснае, не прадаў-

Ты ўнікні, таварыш шарабраз... Народзішка спаганіўся во як... Вось мой сапляк, хлапчук: ты, кажа, татка ад малпы выходзіш...

—Правільна, малайчына хлапец! сказаў госьць і з агідай выцёр абсьлюняныя вусны... Канешна-ж ад малпы...

Сілант разчыніў вусны і аж дыхаць перастаў. Паволі ён разхіляў карак.

—Ага, вось як штука... Дыхнуў ён і раптам шваркнуў бы камням крыкам: Чулі, браты, якія новыя правы?

—Чуеце? Мужык, моў, ад малпы адчапіўся, а іх, талігентаў —Бог стварыў. Брэшаш, нарабраз! Брэшаш! бацюшка, айцец Сяргей. ваша высокаеблагаслаўленьне, шварніце яго ўверх пяткамі...

— Па вобразу свайму і падобію Гасподзь стварыў, прабасіў цьвёрда сьвяшчэньнік. Але.

— Чуў? Сілант упёрся ў бакі, выставіў бруха і зарагатаў.

— Брахня, глум, легэнда, ўспыхнуў госьць, аднак ураз жа пагаснуў. Паслухай! Дзядзька Сілант! таварыш! Цёмны ты чалавек, стараючыся прывясьці да парадку абмякшы свой язык, марматаў ён. Знай: чалавек ідзе ад малпы. Гэта аксіома! Матэрыялісткі падыход да гісторыі... А не папоўскія брэхні... Гэта-ж не поп, а вучоны Дарвін сказаў, вялікі вучыцель...

— Хто? Дар'ін? ашчырыў жоўтыя клыкі Сілант і дыхнуў сівухай проста ў нос гасьцю. Дурак твой Дар'ін, сучы сын твой Мар'ін... Такі яму энэргічны адказ... Ды і ты не разумней яго...

— Што, што? і госьць ашалела заматаў відэльцам з абгрызкам пірага на ім.

Сьвяшчэньнік адсунуўся і замёр. У некалькіх месцах крыкнулі:

— Самі ўмеем!

— К чорту гэных вучыцялёў! і Сілант таўкнуў талерку з грыбамі ў бок нарабраза. Поўнай бутэлькай па патыліцы іх! Школу паганіць? Га? хлопцаў хуліганства вучыць? Га? Ды я лепей вось гэтымі самымі лапамі усю гэтую школу па бэлечкам разьнясу... Мы ў Бога верым, у Бога!...

— Што, падскочыў і сеў нарабраз. Папоўская закваска! Вашую цемру эксплёатуюць, вас водзяць за нос...

На яго лбе напружылася жыла. — Бога няма! Гэта ашуканства!

— Аа... няма? Значыцца мужык ад малпы выходзіць? Адказвай!

— Але! але! але!

— А калі гэтак, дык вось табе... Калі я малпа... На!! — і Сілант напружыўшыся адразу перавярнуў увесь стол разам з самаварам. Браты! праваслаўныя! сіпла роў ён не бачучы сьвету: Атрымоўвай браты новыя правы... Мы цяперака ня людзі, а малпы... Ха-ха! А як мы малпы адіоцкія— дык валі скандал! Бій усі вокны!

* * *

Падгуляўшы нарабраз тросся на возе і матаў галавой, як дохлы гусак.

На душы яго была нудна, больна, а разам розьбіраў сьмех.

— Чорт ведае... Гэткая цемра... Уперад ці ўзад ідзем? Абцуг... Што гэта ёсьць: абцуг? Хы-ы-ы! Змычка-дрэнь! Вось дык самагонка... Ударнаяя! Па-за праграмай...

А побач вярхом на кабыле скакаў Аксён, пьяны, без шапкі. Ен чуць сідзеў трымаючыся абедзьвюма рукамі за грыву.

— Я, значыцца як прадседацель — захацеў правадзіць вашую міласьць. Чаго? Прозьвішча мае? — Аксён Пятроў. Прашу залі... залічаць пад увагу... Лягчэй Паўлуха, лягчай: тутка во пянёк... Нашае начальства Божа барані ня вывярні... Згнаю ў калодках! У парадку дысцыпліны! Вось які я справядлівы чалавек. Чаго? Вядома, мужык — гэта сьві---нь---сьвіньня... Я яго, гэтую сьцерву Сіланта ўраз — у халодную, ў калодкі... Чаго? Ен заўсёды муціць...А я тутка... Н-но! Но! Тпру!.., Но-о... ён споўз каню пад бруха і плюхануўся ў балота.

Канец.

Зьбеларушчыў Б. Д.

шаяся бальшавікам беларускае грамадзянства ведае і шануе старшыню Беларускае Нацыянальнае Рады Заходняе Беларусі, якая вядзе барацьбу за нацыянальныя правы беларусаў ня толькі Заходняй, але і Усходняй Беларусі, сяляне якой праз сваіх прадстаўнікоў просяць аб маральнай дапамозе ў барацьбе з „чырвонай заразай“.

Далей у сваёй карэспандэнцыі гэты комуністычны дзеяч і прыхільнік нямецкага агэнта Луцкевіча, па „загаду“ сваіх вышэйшых „партыйных“ уладаў, піша, што войт Міжэвіцкае гміны вельмі ня добры чалавек.—Чаму? А вось дзеля чаго: раней войтам у нас быў нейкі Савіцкі. У гэты час родны брат „карэспандэнта“ „Беларускае Справы“—Сьцяпан Серкевіч быў у Селявічах zastępcą солтыса і абдзіраў сялян, вымагаючы ад іх бутэлькі „czystej poznańskiej“ за звальненьне ад падводаў. Доўгі час было ўсё „добра“, ажно штосьці папсавалася... Савіцкага скінулі, справа яго пайшла да пракурора, а нам далі новага часовага войта—Чэлея, які павінен быў зрабіць досьледы надужыцьцём папярэдняга войта. І вось аказалася, што Селявіцкі солтыс браў ад каня па 5 злотых. Калі прыйшло распараджэньня зьвярнуць гэтыя грошы сялянам, дык солтыс каму хапеў аддаў, а рэшту заставіў у сваей кішані. Падалі жалабу. Сьледства яшчэ ня скончана. Злодзеі солтысы пакульшто сідзяць у вёсцы і сьмяюцца... Вось тутка і баліць Серкевічам, што новы войт заварушыў іхніх „сваякоў“. Стыд і ганьба зладзеям! Пакрыўджаных — 12 бяднейшых сялян. Злуюцца Серкевічы на новага войта і за тое, што ён сьмяротны вораг комуністаў і робіць ім у іхняй „працы“ розныя перашкоды.

У канцы сваей карэспандэнцыі Селявіцкі брахун пяе „гімн“ агэнту Луцкевічу і яго лейб-органу „Белар. Справе“, якой нам прысылаюць тут ажно 22 нумары. Шлюць, разумеецца, *дарма*, бо ведама — маюць грошы!.. Серкевіч піша аб тым, што я быццам ня бачу да чаго імкнецца беларус — селянін. Я добра ведаю чаго беларусы жадаюць, ведаю як нашыя сяляне ня любяць „хвосьцікаў комуны“. З вераю яны чакаюць тае хвіліны, калі згіне нарэшце крывавае „чэка“ ў Усходняй Беларусі, а разам з ёю згінуць і ўсе „прыяцелі—хвосьцікі“ яе тут у нас. Годзі ўжо нямецкім агэнтам Луцкевічам і розным яго „прыхвасьням“ Серкевічам цурыць „совраем“ галавы нашай моладзі. У гэтым раю беларусы паўстаюць проці маскоўскіх „апрычнікаў“ (паўстаньне лістападаўцаў). Будзем гнаць і мы сваіх „чэкістаў“. Работа іхняя нам не патрэбна.

Т. М.

Ня трэба гэткіх „абаронцаў“.

(в. Мыслава, Слонімск. пав.).

У адным з апошніх нумароў комуністычнай газэціны „Белар. Справа“ была надрукована карэспандэнцыя пад загалоўкам „Свой свайго хваліць, а праўду ганіць“. Аўтар гэтае брахлівае карэспандэнцыі, добра нам усім тут ведамы, піша пекныя словы аб беларускай справе, але мы, — ягоныя суседзі, добра ведаем аб яго „дзейнасьці“ на карысьць беларускай нацыянальнай справы. Вядомая справа, што чорт ня будзе хваліць Бога, а анёл—люцыпара. Гэтак сама нельга дамагацца і ад аўтара комуністычнага напрамку, каб ён хваліў сваіх ворагаў.

Але я хацеў бы спытацца ў яго: аб якой гэта сваёй працы на карысьць беларусаў, ды яшчэ бедных сялян у нашым павеце ён гаворыць? Мы аб гэтай працы нешта нічога ня чулі. Як раз наадварот, мы ўсе тут добра ведаем, што гэтаму аўтару патрэбны не беларускі рух, а „іншы“—зусім чужы беларускаму народу. Цікава, што аўтар, які вельмі хваліць бальшавіцкі „рай“, дзе нямашака „чыноўнікаў па беларускім справам“ (а ёсьць толькі „чэка“), зусім яшчэ нядаўна сам... уцёк адтуль. Так! Мы ведаем, што ёсьць шмат балячкаў і тут у нас, але „там“ у „раі“ добра жывецца толькі адным камісарам—чужынцам, а беларускі селянін толькі... плача...

Аўтар піша, што ў в. Мыслава войт Чалей пазабіраў за падаткі падушкі. Але чаму ён ня піша аб тым, што рабіў войт Савіцкі ў Пасінічах, Клепачах і Селявічах? Колькі дзякуючы яму сьлёзаў там пралілося!?. І гэты быў свой войт!

Далей аўтар плача і наракае на долю селяніна-беларуса. Нам не патрэбны гэтыя фальшывыя сьлёзы! Дзе вы былі раней нашыя цяперашнія апякуны? Дзе вашая праца на карысьць беларускае справы? Ці ня вы гэта, калі ў нас на Слонімшчыне зачынілі апошнюю беларускую школу, а вучыцеля звольнілі, сьмяяліся над гэтым і гаварылі: *„что это за белорусскій языкъ? Вотъ русскій языкъ — это дѣло другое!“* Для вас тады беларуская мова была брыдкай і нягоднай. А цяпер вашая бязчэльнасьць дайшла да таго, што вы называеце сябе „дзеячамі“ і „апякунамі“ беларускага народа. Непатрэбны нам гэткія „апякуны“, якія саромяцца сваёй роднай мовы.

Аўтар пяець славу „адзінай заступніцы—„Беларускай Справе“ і „Грамадзе“. Але скажыце на ласку—калі і дзе вашыя „грамадзкія“ паслы за нас „заступіліся“? Ці бачылі мы каго з іх тут на Слонімшчыне і што яны для нас зрабілі? Даюць нам дэмагогію і паказваюць... дулю! Няхай хаця-бы адзін з іх ахвяраваў з сваёй вялікай пэнсіі хаця-бы невялічкі працэнт на беларускі дзіцячы прытулак у Горадні. Аб гэтым нешта нічога не чуваць! Апрача шкоды для беларускай нацыянальнай справы мы ад вас нічога ня бачылі. Дык не патрэбна нам і вашае „заступніцтва“. Мы самі патрапім сябе абараніць.

Селянін.

Адчыненьне бібліятэкі-чытальні.

(в Вязавец, Дзятлаўск. гм.).

4 ліпня г.г. у вёсцы Вязавец, Дзятлаўскай гм., Наваградзк. пав. адбылося ўрачыстае адчыненьне бібліятэкі-чытальні пры Сэкрэтарыяце Беларускай Нацыянальнай Рады і гуртка Т-ва „Прасьветы“. А 2 гадз. у памешканьні бібліятэкі, па ініцыятыве Старшыні Сэкрэтарыяту Гарбуна, сьвяшчэньнікам а. Тодарам Сіглюкам быў адслужаны малебен пры вучасьці царкоўнага хору. Пасьля малебну сьвяшчэньнік сказаў прамову, у якой выказаў пажаданьня пасьпеху ў пачатай культурнай беларускай працы. На адчыненьне бібліятэкі сабралася шмат сялян з суседніх вёсак. Народу было гэтулькі, што хата бібліятэкі-чытальні не магла памесьціць усіх жадаючых пачытаць газэту „Беларускае Слова“ і свае родныя беларускія кніжкі. Доўга ў нас панавала цемра, але нарэшце заглянула сонца і ў наша ваконца. Дзякуючы дапамозе Т-ва „Прасьветы“, якое пайшло нам на сустрэчу, мы маем цяпер культурную пляцоўку, якая дасьць нам магчымасьць пашыраць нацыянальную сьвядомасьць сярод сялянскіх беларускіх мас. Трэба зазначыць, што пункт у нас вельмі добры; народу зьбіраецца шмат і пры далейшай дапамозе з цэнтру культурная праца дасьць тут добрыя рэзультаты.

Просім паважаную рэдакцыю „Беларускага Слова“ зьмясьціць гэтыя колькі радкоў на сваіх шпальтах.

(На арыгінале 12 подпісаў).

Тутэйшая хроніка.

Скасаваньне цыркуляра. Міністэрства Асьветы выдала распараджэньне аб скасаваньні цыркуляра б. міністра Ст. Грабскага, якім вымагалася, каб выкладаньне агульных гісторыі і географіі ў школах нацыянальных меншасьцяў адбывалася ў польскай мове. Прадметы гэтыя цяпер могуць выкладацца ў матчынай мове. Толькі географія Польшчы, гісторыя Польшчы і польская літэратура павінны і далей выкладацца ў польскай мове.

Дадатак да падаткаў. Апублікавана распараджэньне Міністра Фінансаў аб павялічэньні падаткаў на 10 прац. Павялічэньне гэтае не стасуецца да падаткаў: падаходнага, маёнтковага і кватэрнага, а таксама падаткаў самаўрадавых. У зьвязку з гэтым павялічаны ад 16 ліпня на 10 прац. і ўсе гербавыя аплаты. Гэткім чынам тыя прашэньні, якія раней аплачваліся 2 злотымі, цяпер трэба аплачываць маркамі на 2 зл. 20 гр.

Вунія не падабалася. У свой час шмат шуму ў Вільні нарабіў пераход у вунію праваслаўнага сьвяшчэньніка Куліка-Наўменка і дзяка Швэдкі. Гэтымі днямі Кулік-Наўменка і Швэдка ізноў вярнуліся ў праваслаўе.

Адчыненьне Сьніпішскай царквы. У праваслаўнай царкве на Сьніпішках, якая была зачынена ад пачатку вайны, 25 ліпня ізноў пачаліся набажэнствы. Царква нанова адрэмантавана.

Плата за кватэры. Плата за кватэры з аднаго пакою і кухні выносіць цяпер 43 прац. даваеннай платы, а значыцца за кожны даваенны рубель трэба плаціць 1 зл. 43 гр. Гэткая аплата будзе абавязываць да канца гэтага году.

Паменшаньне безрабоцьця. У зьвязку з пачаткам палявых работ на тэрыторыі Віленшчыны значна паменшылася безрабоцьце. Напрыклад у Віленска-Троцкім павеце, дзе перад жнівам было каля 1.000 безработных, цяпер засталася іх толькі 400. У самай Вільні лічба безработных за апошні тыдзень паменшылася на 46 чалавек.

Патрэбны работнікі. Віленскае Бюро Пасрэдніцтва Працы (Завальная вул. 2) шукае работнікаў на выезд у Наваградчыну на лясныя работы. За апошнія дні выслана на гэтыя работы каля 100 чалавек. Работнікі павінны мець уласныя сякеры і адну пілу на 2-х чалавек.

Цукер падаражэў. У зьвязку з падвышкай ад 16 ліпня акцыза на 10 прац. падаражэў цукер на 3 зл. 50 гр. па ворку ў 100 кілёгр. У дэталічным гандлю цана цукру падвышана на 3 з пал. гроша за кілёгр.

Хлеб патанеў. У зьвязку са зьніжкай курсу даляра хлеб патанеў на 10—15 прац. Прадбачыцца зьніжка цэнаў на каленіяльныя тавары і мяса. Паступіла на рынак новае жыта, якое прадаецца па 22—23 зл. за 100 кілёгр.

Які будзе ўраджай. Па данным Галоўнай Статыстычнай Камісіі, ўраджай жыта ў Польшчы ў гэтым годзе прадбачыцца ня менш леташняга.

Асьцярожна з долярамі. У апошні час каля савецкай граніцы паявілася шмат фальшывых даляраў, якія вельмі добра падробляны і зусім нязначна розьняцца ад праўдзівых. Есьць пэўныя данныя, што даляры гэтыя перасылаюць у Польшчу бальшавікі.

Курс на грошы. Курс злотага сыстэматычна павышаецца. Афіцыяльны курс даляра—8 зл. 98 гр.; чорная біржа плаціць нават яшчэ менш—8 зл. 90 гр. За 10 рублёў золатам даюць 46 злотых.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

К. Маеўскаму. Ліст атрымалі. Па прысланым адрасам газэту пасылаем.

„Голасу Беларуса“. Просьбу спаўняем.

Разумніку. Карэспандэнцыі атрымалі, скарыстаем у наступным нумары. Па прысланым адрасам газэту пасылаем.

Biuro Dzienników „Uniwersal“ Газэту пасылаем. Падпіска на 3 месяцы каштуе 2 зл. 50 гр.

Наваградзкай Гімназіі. Просьбу споўнілі.

С. *Зеленеўскаму.* Газэту пасылаем. Грошы прышлеце калі будзеце мець.

С. *Цімафееву.* Пасылаем пробны нумар; калі хочаце атрымліваць далей—прышліце падпіску.

П. Кліманповічу. Пасылаем пробны нумар—прысылайце падпіску.

П. Левановічу. Просьбу споўнілі, ці атрымліваеце газэту?

Абвестка.

Інтэлігэнтная асоба—добрая швачка, шукае працы на дому.

Адрас: Зьвярынец, вул. Манюшкі 25, 2.

Наваградзкая Беларуская 8-х кл. Гімназія

прырода-матэматычнага тыпу

даводзіць да ведама грамадзянства, што прыймовыя экзамены вучняў на 1926—27 школьны год ува ўсе клясы Гімназіі адбудуцца

восеньню—ад 1 да 10 верасня.

Заявы аб дапушчэньні дзяцей да экзаменаў падаюць іх бацькі, або апякуны

Да заявы трэба далучыць:

1. Мэтрыку аб нараджэньні вучня,
2. Пасьведчаньне доктара аб прышчэпе воспы,
3. Дакумэнты аб папярэдняй адукацыі, калі паступаючы вучыўся ў якой школе.

Жадаючыя паступіць у 8 клясу, або перавясьціся з іншай Гімназіі ў гэтую клясу, павінны зьвярнуцца з просьбаю да Kuratorjum Okręgu Szkolnego Białostockiego w Białymstoku, аб дазволе, далучыўшы да паданьня вышэйазначаныя дакумэнты.

Заняткі ў Гімназіі пачнуцца 1-га верасьня.

Навука ў першай клясе — безплатная.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Хто можа ахвяруйце кніжкі хоць у якіх мовах на Бібліятэку ім. Фр. Скарыны ў в. Барадзенічах, Браслаўскага пав.

Кніжкі можна перадаваць праз рэдакцыю „Беларускага Слова„.

Урад Бібліятэкі.

Адказны Рэдактар Т. Верпікоўскі. Друк А. Дворжэца Завальная 32. Выдавец Бел. Нацыянальная Рада